## ПРАДМОВА

# Гародня як цэнтр прыцягнення

*Хрыстос ішоў між дрэў, адводзячы галіны,*
*і лістота нібы плакала блакітам: падала раса.*
*Каложа ўстала перад ім у месячным ззянні*
*такая простая, такая дасканалая,*
*што перахапіла дых…*

У. Караткевіч. «Хрыстос прызямліўся ў Гародні (Евангелле ад Іуды)»

Класік беларускай літаратуры Уладзімір Караткевіч блаславіў Гародню прыходам Хрыста. Ён зрабіў найлепшы падарунак для горада, па-мастацку дасканала апісаўшы яго ў часы Вялікага Княства Літоўскага. Так сталася, што Гародня заўсёды прыцягвала вялікіх людзей і вялікія падзеі.

Асноўнай тэмай дадзенага нумара «ARCHE» стала Гародня як цэнтр прыцягнення. Геаграфічнае становішча дало магчымасць гораду быць важным адміністрацыйным цэнтрам на працягу стагоддзяў. Адпаведна Гародня паўплывала на рэгіён, стала месцам гістарычных падзей, істотных не толькі для Гарадзеншчыны, але і для краіны.

Рэгіяналістыка як даследчы кірунак даўно склалася ў навуцы і прыносіць плённыя вынікі. Дэталёвае вывучэнне асобнага рэгіёна дае магчымасці выявіць як лакальныя тэндэнцыі, так і асаблівасці працякання ў ім гістарычных працэсаў. Лакальная гісторыя можа быць прадстаўлена ў даволі шырокім спектры тэмаў: сістэма кіравання, сацыяльныя адносіны, штодзённасць і інш. Пры гэтым гістарычны матэрыял дазваляе выкарыстоўваць розныя метады даследавання: ад класічных да сучасных.

## ПРАДМОВА

Вопыт вывучэння Гародні і Гарадзеншчыны назапашаны даволі вялікі, але, канешне, далёка не ўсе пытанні на сённяшні дзень вывучаныя. Дадзены нумар запаўняе пэўныя прагалы ў рэгіянальнай гісторыі і дае імпульс для далейшага яе даследавання.

Значная частка нумара прысвечана гісторыі Гародні ў перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Перыяд Сярэднявечча прадстаўлены артыкуламі Алега Ліцкевіча і Сяргея Палехава. На падставе нямецкіх крыніц Алег Ліцкевіч грунтоўна прадставіў камунікацыі, населеныя пункты, склад і міграцыі насельніцтва Гарадзеншчыны ў другой палове XIII—XIV стст. Расійскі даследчык Сяргей Палехаў прааналізаваў малавывучаную ў гістарыяграфіі Гарадзенскую унію 1432 г. і яе ролю ў палітычнай сітуацыі ВКЛ.

Рэалізацыя артыкулаў Статутаў ВКЛ 1566 і 1588 гг. у практыцы Гарадзенскага земскага суда разгледжана Людмілай Івановай. У працы польскага даследчыка Анджэя Страйноўскага ўвага была засяроджана на пачатковым этапе дзейнасці гарадзенскага сойма 1784 г. Уражанні ад Гародні ў мемуарах і ліставанні прааналізавала польская даследчыца Магдалена Уйма. Асноўнай тэмай артыкула Наталлі Сліж сталі злачынствы ў Гародні ў XVII ст.

Тры артыкулы прысвечаныя гарадзенскай архітэктуры. У працы Кацярыны Дзянісавай разглядаюцца інскрыпцыі ў гарадзенскім касцёле Адшукання Святога Крыжа. Артыкул Дзмітрыя Віцько з'яўляецца працягам дыскусіі па выглядзе Старога замка ў перыяд кіравання Вітаўта. У артыкуле польскай даследчыцы Аляксандры Зёбер засяроджана ўвага на інвентары гарадзенскага Новага замка 1750 г.

Перыяд XIX — пачатку XX стст. разгледжаны ў артыкулах Вячаслава Шведа (адрасы паўстання 1863—1864 гг.) і Андрэя Кіштымава (віціны на водных шляхах Беларусі).

Жыццё Гародні міжваеннага часу прадстаўлена ў малавядомых тагачасных артыкулах Юзафа Мацкевіча, перакладзеных з польскай мовы Андрэем Вашкевічам і Таццянай Казак, а таксама ў працы Таццяны Касатай, прысвечаных кінатэатрам, што тады працавалі ў горадзе. Нарэшце, артыкул Віктара Парфёненкі прысвечаны выбітнай для Гародні асобе — Алесю Пятровічу Госцеву, які шмат зрабіў для захавання і абароны гістарычнай спадчыны горада.

Такім чынам, нумар ахоплівае перыяд ад Сярэднявечча да сучаснасці, дадаючы ў агульную скарбонку новыя веды па гісторыі Гародні і Гарадзеншчыны ў сферы палітыкі, архітэктуры, культуры, эканомікі і інш. Выказваю шчырую падзяку аўтарам нумара за ўдзел у яго стварэнні і ўнёсак у даследаванне гісторыі рэгіёна.

*Наталля Сліж*